Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Магілёве вынесена папярэджанне назіральніку ад БХК

07.08.2016 **Тэгі**: выбары-2016



Барыс Бухель, Магілёў

Старшыня камісіі Магілёўскай-Кастрычніцкай выбарчай акругі №86 Аляксандр Кажамякін 5 жніўня вынес папярэджанне назіральніку ад Беларускага Хельсінкскага камітэта, праваабаронцу Барысу Бухелю. Пра гэта распавёў сам назіральнік.

Як паведаміў Барыс Бухель, вынесенае папярэджанне з'яўляецца проста помстай Кажамякіна за скаргу, накіраваную ў аблвыбаркам на адмову ў прадастаўленні інфармацыі сябрамі акруговай камісіі.

"Я ў папярэдні раз, калі не было пасяджэння, зайшоў задаць тры пытанні - калі будзе адказ на маю заяву, мне сказалі, што паслана па пошце, калі будзе пасяджанне, таксама сказалі, што будзе аб'ява. Трэцяе пытанне - даведацца колькі здадзена подпісаў і за каго. Мне даваць інфармацыю адмовіліся, я стаў настойваць, сказаў, што гэта публічная інфармацыя", - распавёў Бухель.

Паводле яго, ён пачаў прыводзіць аргументы пра абавязак у прадастаўленні такой інфармацыі, грунтуючыся на артыкуле 13 Выбарчага кодэкса аб адкрытасці і галоснасці выбараў. "Была сакратар камісіі Сафонава. Яна патэлефанавала Кажамякіну. Ён адмовіў. Я пайшоў і напісаў скаргу на адмову ў прадастаўленні інфармацыі ў абласную камісію. І сёння нечакана за тое, што нібыта я гаварыў і тлумачыў 13 артыкул, мне вынесена папярэджанне", - адзначыў праваабаронца, паведаміўшы, што пакуль адказу на сваю скаргу не атрымаў.


Ён таксама паведаміў, што, выносячы папярэджанне на пасяджэнні камісіі, Кажамякін заявіў, што Бухель нібыта публікаваў недзе недакладную інфармацыю. "Пры гэтым ён не патлумачыў, што за інфармацыя, і дзе яна была апублікаваная", - сказаў назіральнік.

Барыс Бухель заявіў пра намер абскардзіць папярэджанне.

“Праваабаронцы за свабодныя выбары”

Твитнуть





ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?


У палітвязня ў турме здарыўся інфаркт і інсульт. Яго адправілі ў калонію

"А ў чым мне прызнаваць віну?" Гісторыя палітвязня з чырвонай біркай

Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык







ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?

Затрыманні музыкаў, ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 9 чэрвеня

Для актывіста Беларускага Незалежнага прафсаюза абвінавачанне запрасіла чатыры з паловай гады калоніі

Жанчыну асудзілі на год калоніі за рэпост публікацыі з выявай надмагільнай пліты Лукашэнкі

Мужчыну асудзілі на тры месяцы арышту за абразу двух амапаўцаў

У Баранавічах студэнтку судзілі за абразу Лукашэнкі наўпрост ва ўніверсітэце

Берасцеец атрымаў год калоніі за абразлівае слова на адрас Лукашэнкі

Затрыманні ў Мінску і Дубровенскім раёне: хроніка пераследу 8 чэрвеня

У навагоднюю ноч пінчук пакінуў каментар пра Лукашэнку. Цяпер яго асудзілі да 2 гадоў "хіміі"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА


ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY